SunRav BookReader - Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі
Файл Раздел Вид Панели Избранное Справка
Назад

# УВОДЗІНЫ

«Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі» – інтэграваная вучэбная дысцыпліна, якая знаёміць студэнтаў з сістэмай і гісторыяй летазлічэння народаў свету, развіццём каляндарных стыляў на беларускіх землях, паняццямі «хранонім», «Нагаводдзе / Навалецце», «народны каляндар», «беларускі народны каляндар» (БНК) і інш. Яна непасрэдна звязана з гісторыяй сусветнай культуры, гісторыяй беларускай культуры, фалькларыстыкай, этналогіяй, культуралогіяй. Каляндар і каляндарна-абрадавая паэзія беларусаў – найбольш значная і багатая старонка спадчыны, што ярка вылучаецца ў традыцыйнай еўрапейскай культуры.

У адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта па спецыяльнасці для другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратуры) 1-08 80 02 – Тэорыя і методыка навучання і выхавання (сусветная і айчынная культура) вучэбная дысцыпліна «Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі» ўваходзіць у цыкл дысцыплін па выбары. У аснову структуравання вучэбнага матэрыялу пакладзены гістарычны і тыпалагічны падыходы, якія вызначаюць логіку выкладання дысцыпліны. З мэтай грунтоўнага вывучэння магістрантамі асаблівасцей і гістарычных ўмоў складання разнастайных каляндарных стыляў прапануецца паслядоўнае засваенне тэарэтычных асноў (асноўных тэрмінаў і паняццяў, этапаў і форм развіцця календара ад часоў узнікнення і да сучаснасці ў гістарычнай эвалюцыі) з наступнай адпрацоўкай практычных навыкаў, звязаных са зместам вывучаемага матэрыялу.

Дадзеная вучэбная дысцыпліна з'яўляецца адной з важных у сістэме падрыхтоўкі выкладчыкаў па культуралагічных дысцыплінах, паколькі накіравана на актывізацыю і сістэматызацыю ведаў, якія былі набытыя на прадметах культуралагічнага і народазнаўчага цыклаў, дазваляе практычна выкарыстаць і ўдасканаліць атрыманыя ўменні і навыкі, садзейнічае развіццю педагагічных, псіхалагічных і арганізатарскіх здольнасцяў магістрантаў, іх асабістаму развіццю і ўдасканаленню.

Мэта вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі» – сістэматызацыя і паглыбленне ведаў па сродках і прынцыпах летазлічэння розных народаў і часоў, па беларускім народным календары (БНК) у кантэксце гісторыі культуры народаў свету.

Дысцыпліна прызначана для навучання магістрантаў дзённай і завочнай форм атрымання вышэйшай адукацыі. Асноўнымі формамі працы па дысцыпліне з'яўляюцца лекцыі, на якіх даецца абагульнены матэрыял. Ён дазваляе разгледзець заканамернасці развіцця календара ў розныя перыяды гісторыі грамадства. Важнай формай навучання з'яўляюцца семінарскія заняткі. Іх мэта – паглыбіць і пашырыць веды магістрантаў шляхам стымуляцыі самастойнай працы над асобнымі пытаннямі і праблемамі. У час вывучэння курса праводзяцца групавыя і індывідуальныя, анлайн-кансультацыі.

Асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання, якія адлюстроўваюць мэту і задачы дысцыпліны, з'яўляюцца: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне матэрыялу, пошукавы і даследчы метады); тэхналогія навучання як вучэбнага даследавання; камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (разумовы штурм, дыскусія, спрэчка-дыялог, круглы стол і інш.). Сярод форм правядзення семінарскіх заняткаў могуць ужывацца калёквіумы, тэсты, а таксама традыцыйныя формы кантролю ведаў (вусныя адказы, комплексныя кантрольныя работы, паведамленні і рэфераты). Немалаважнае значэнне для развіцця самастойнага мыслення магістрантаў, іх ініцыятывы, умення адшукаць неабходны матэрыял мае напісанне імі дакладаў (паведамленняў) па тым ці іншым пытанні стварэнне тэстаў і прэзентацый.

Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае павышэнне ўзроўню прафесійнай кампетэнцыі па асобных пытаннях методыкі даследавання каляндарных традыцый. Асноўнымі формамі самастойнай работы студэнтаў з'яўляюцца: праца з літаратурай, падрыхтоўка дакладаў, рэфератаў па прапанаванай выкладчыкам тэматыцы, прагляд відэаматэрыялаў, наведванне музеяў, выстаў, канцэртаў, праца з інтэрнэт-рэсурсамі.

Дадзены дапаможнік уключае *тэарэтычны раздзел,* які змяшчае матэрыялы для самастойнага тэарэтычнага вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі» ад вытокаў да пачатку XXI ст.; *практычны раздзел,* які змяшчае матэрыялы для правядзення семінарскіх заняткаў, прыкладную тэматыку дакладаў у межах кантралюемай самастойнай работы, пытанні і заданні для замацавання ведаў і адпрацоўкі навыкаў; *дапаможны раздзел*, у якім прадстаўлены гласарый, спіс рэкамендуемай літаратуры і дадаткі. Аўтары 1–3, 8, 9, 12 тэм, дадаткаў – А. Ю. Лозка і Н. Г. Мазурына, усіх астатніх тэм і раздзелаў – Н. Г. Мазурына.

Прапануемы вучэбна-метадычны дапаможнік закліка볼 паспрыяць больш эфектыўнаму фарміраванню сістэмы абагуленых ведаў па вучэбнай дысцыпліне «Каляндар у часе і прасторы: вытокі, сінтэз культур, стылі», а таксама ўменняў, якія складаюць прафесійную кампетэнтнасць выпускніка другой ступені ВНУ. Ён дае магчымасць самастойнага вывучэння асобных тэм вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з вызначанымі ў вучэбнай праграме ўстановы вышэйшай адукацыі патрабаваннямі да ўзроўню засваення матэрыялу; паглыбленага вывучэння і паўтарэння асобных раздзелаў; удасканалення ўзроўню ведаў, карысных пры падрыхтоўцы да калёквіумаў, тэстаў, заліка. Заданні і матэрыялы маюць розную ступень складанасці, таму ў залежнасці ад задач выкладання дапаможнік можа быць карысным як студэнтам ВНУ, магістрантам, навуковым работнікам, так і шырокаму колу карыстальнікаў.

*Наталля Мазурына*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ